# Фальклarystычныя даследаванні

## КАНТЭКСТ. ТЫПАЛОГІЯ. СУВЯЗІ

*Зборнік навуковых артыкулаў*

ВЫПУСК 12

Пад навуковай рэдакцыяй
Т. В. Лук’янавай, С. В. Шамякінай

Мінск
«Права і эканоміка»
2015

УДК 398
ББК 63.582
Ф19

Зацверджана кафедрай тэорыі літаратуры
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
14 мая 2015 года, пратакол № 8

Рэдакцыйная калегія :
В. П. Рагойша (старшыня); Г. А. Барташэвіч; А. У. Марозаў;
А. М. Андрэеў; А. І. Бельскі; Л. П. Касцюкавец

Навуковыя рэдактары :
Т. В. Лук'янава, С. В. Шамякіна

Укладальнік: В. В. Прыемка

Ф19 **Фалькларыстычныя** даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. Вып. 12 / пад нав. рэд. Т. В. Лук'янавай, С. В. Шамякінай; уклад. В. В. Прыемка; БДУ. – Мінск : Права і эканоміка, 2015. – 266 с.
ISBN 978-985-552-489-3.

У дванаццаты выпуск навуковага зборніка, падрыхтаванага кафедрай тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, увайшлі артыкулы, прысвечаныя актуальным праблемам фалькларыстыкі, а таксама даклады, агучаныя на II Рэспубліканскім навукова-метадычным семінары «Сучасная фалькларыстыка, міфалогія, этналогія: пазітыўныя, негатыўныя, супярэчлівыя вектары руху», праведзеным 25 кастрычніка 2014 г. на філалагічным факультэце БДУ.

Адрасуецца спецыялістам у галіне фалькларыстыкі, міфалогіі, этналогіі, літаратуразнаўства і мовазнаўства, студэнтам і магістрантам, а таксама тым, каго цікавяць пошукі сучаснай навукі.

*У афармленні вокладкі выкарыстаны малюнак з аўтарскай працы беларускай мастачкі Яўгеніі Сухаверхавай «Беларускі каляндар–2008. Неба і зямля: спевы краю».*

**УДК 398**
**ББК 63.582**

**ISBN 978-985-552-489-3**

© Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2015
© Афармленне. ВТАА «Права і эканоміка», 2015

***Наталля Базар***

## ФАЛЬКЛОРНЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ НІНЫ МАЦЯШ

Даследчык літаратуры В. Смаль адзначае: «На пачатку паэтычнага шляху фалькларызм быў для Н. Мацяш своеасаблівым этапам творчага станаўлення і ў меншай ступені стылізаваным перайманнем народных вобразаў, метрыкі, прасодыі. Працэс увядзення фальклору ў паэтычную тканіну адбываўся ў яе на генетычным узроўні, як падсвядомы зварот да этнічных вобразаў-архетыпаў: МАЦІ, РОДНЫ ПАРОГ, ЖЫЦЦЁВЫЯ ДАРОГІ, БЯРОЗА» [2, *11*].

І сапраўды, цераз паэзію Н. Мацяш праходзяць фальклорныя матывы. Будучая паэтэса нарадзілася ў вёсцы, выхоўвалася ў звычайнай сялянскай сям'і, вось і ўвабрала ў сябе з дзяцінства багатую народную спадчыну. Ад старэйшых слухала казкі, паданні, прыказкі і прымаўкі, загадкі, вельмі часта чула матчыны песні. Песня заўжды жыла і жыве з народам: у розных абставінах у розныя часы людзі спявалі. Спявалі пра каханне, пра горкую сірочую долю, пра няўдалае жыццё замужам – пра ўсё. У «Паэме жніва»,

паэме болю аб страце маці, Н. Мацяш просіць: «*Памажы мне, песня, акрыяць*» [1, *228*]. Яна разумее, што толькі песня можа суцешыць чалавека, падтрымаць, калі цяжка. А тым больш тады, калі не стае блізкіх і дарагіх сэрцу людзей, убачыць якіх жывымі на гэтым свеце ўжо ніколі не давядзецца. У паэме прысутнічае стылізацыя пад народную песню-галашэнне:

*Ой, ляцела зязюленька*
*Цераз круту гору.*
*Пасеяла пшанічаньку,*
*Выжала палову.*

*Ой, навошта ж мне палова,*
*Як зерня не маю?*
*Ой, нашто ж мне жыць на свеце,*
*Як мамы не маю?...* [1, *226*].

Народныя песні Н. Мацяш часта трансфармуе ў творах аб маці. «*У гародчыку спее мачына, / За сталом звініць песня матчына*» [1, *27*], піша паэтэса ў вершы «Пры песні» і тут жа робіць устаўку:

*– Ой, жураўку, жураўку,*
*Чаго крычыш на ранку?*
*– Ой, як жа мне не крычаць? –*
*Трэба высака лятаць…* [1, *27*].

Адразу пасля гэтага ўрыўка, таксама набліжанага да народнай песні, што спявала маці, паэтэса быццам бы працягвае яе:

*Падхаплю жалю мову шчырую:*
*Не вяртаецца жораў з выраю.*

*Хай не журыцца, хай не плачацца:*
*Далягляд з жальбы не зыначыцца.*

*Шкода толькі дня, той нядзелі мне,*
*Што святочнасцю так абдзелена* [1, *27*].

«*Вяртае мама песняй маладосць сваю*» [1, *62*], піша Н. Мацяш у «Песні матчынай маладосці» і тут жа прыводзіць набліжаны да фальклорнага тэкст:

*…Насыпаў пшанца*
*Аж па каленца,*
*Наліў вадзіцы*
*Аж па крыліцы.*

*Галубка не есць,*
*Галубка не п'е,*
*На круту гару*
*Усё плакаці ідзе* <…> [1, *62*].

У шэрагу вершаў сустракаюцца такія ўстаўкі, быццам з цэлых куплетаў беларускіх народных песень, напрыклад, у вершы «Тры каласкі любові і смутку» [1, *234*]. У «Паэме жніва» [1, *226*] такія ўстаўкі аўтар робіць неаднаразова.

Але не толькі для ўставак для вершаў выкарыстоўвала Н. Мацяш народныя песні. Менавіта радкі з народных песень сустракаем у якасці эпіграфаў да вершаў: «*Ой, у полі крыніца стаяла.. З народнай песні*» [1, *280*] да верша «Маналог крыніцы, якую закідалі каменнем». Адзначым, што, акрамя песенных радкоў, сярод эпіграфаў – прыказкі і прымаўкі: «*Ластаўка вясну пачынае, восень наклікае. Народнае*» [1, *65*] да верша «Восень». Ужыванне ў якасці эпіграфаў слоў, выразаў з беларускага фальклору сведчыць пра ўменне паэтэсы развіваць у вершы аб сутнасці выказанага ў эпіграфе. Гэта азначае, што Н. Мацяш добра ведала вусную народную творчасць і ўводзіла яе элементы ў свае творы.

Сустракаюцца ўжытыя ў вершах невялікія (дробныя) словавобразы: *чараўніца, воран, кажан, карагач, варажбітка, цыганка, скрыпач, жар-птушка з казкі, светлазарная птушка*. Ёсць і свая *Васіліса*. Гэта азначае, што фальклорна-казачныя матывы арганічна прысутнічаюць ў паэзіі Н. Мацяш.

Першыя свае казкі чалавек чуе ў раннія гады жыцця. Узнікла казка ў глыбокай старажытнасці, а таму стала той кнігай, па якой чалавек вучыцца жыць. Хоць Н. Мацяш казкі не пісала, але яны паўплывалі на яе паэзію. Казачны зачын ёсць у некаторых вершах: «*За гарамі, за даламі, / За бяссоннымі начамі, / Жыў ды быў вялікі цар – / Смутак, духу валадар*» [1, *381*], «*Жыла-была рака*» [1, *338*], «*Міналі месяцы, гады…*» [1, *57*]. Казкавыя карані заўважаюцца ў метафарыстыцы і персаніфікацыях Н. Мацяш: «*Вялікі цар – Смутак*» – моцны ўладар Сусвету; «*рака*» – цікавіцца ўсім у свеце і прагне новых адкрыццяў, а потым гіне літаральна ў адным кроку ад такога чаканага адкрыцця; «*ноч*» – цыганка, якая «*каля ганка прыйшла прарочыць-варажыць*».

Н. Мацяш лічыць, што «*над кожнаю душой / Свой воран кружыць…*» [1, *36*]. Гэта той самы воран, які па народным павер'і прыносіць няшчасце. Пазбавіцца ад яго можа дапамагчы толькі чараўніца. Але яе няма нідзе, бо аказваецца над чараўніцай таксама кружыць воран. Аднак выйсце ёсць. І выйсце, збавенне ад цяжкай долі – тры чароўныя дудачкі:

*Ах, чароўныя дудачкі з матчынай казкі!..*
*Падзьмеш у адну –*
*і высахнуць слёзы;*
*У другую падзьмеш –*
*засмяешся знячэўку;*
*Возьмеш трэцюю –*
*пусцішся ў скокі…*
*Ах, чароўныя дудачкі з матчынай казкі!* [1, *7*].

І зноў «але». Каб іх знайсці і зайграць, трэба патраціць палову жыцця. І тады яны стануць сапраўднай узнагародай для пабітага лёсам чалавека:

*Але ў першую дудку*
*таямнічага слова*
*падзьму –*
*Высыхае слязіна;*
*Паднясу другую да вуснаў –*
*і ўсміхацца гатова;*
*А на трэцяй зайграю –*
*смех пакloніцца нізка слязе*
*За спатканае шчасце* [1, *7*].

Яшчэ знайсці шчасце, як верылі нашы продкі-язычнікі, можна пры дапамозе папараць-кветкі, што цвіце ў купальскую ноч: «*Яна ж некалі спраўдзіцца, / Казка пра папараць-кветку. / Абавязана спраўдзіцца*» [1, *372*]. Але трэба толькі шукаць: «*А Купалка зноў гукае / Ночкі цёмнай не баяцца, / Кветку-папараць шукаць…*» [1, *295*].

Дрэвы-сімвалы: вярба, бярозка, яліна, шыпшына, арабіна – як беларускія дзяўчаты, жанчыны з горкай доляй. Аб цяжкім жыцці жаліліся яны бярозцы і бярозка высыхала, бо прымала ўвесь боль, горыч і бяду той, якая шукала ў яе парады. Лірычная гераіня аднаго з такіх вершаў пра бярозку з жалем кажа:

*Зноў сад магутна раскашуе*
*На попеле і на крыві.*
*Адно мяне, бярозку тую*
*Чацвёртую – не ажывіць.*

*Калі ад душ кара адстане?*
*Крычы, мой лёс, пячы, шчымі,*
*Каб людзі ў шматмільярдным стане*
*Нарэшце зваліся людзьмі*! [1, *427*].

Да вярбы таксама людзі прыходзілі з жалем, з болем: «*Хто ўпершыню назваў цябе плакучай, / Самотная вярбіначка-вярба? / Відаць, вялікім горам быў засмучаны, / Нязмернаю была яго журба*» [1, *278*]. І Н. Мацяш прыходзіць да высновы, што «*ці не паэт назваў цябе плакучаю, / Вярба мая, сястра мая?*» [1, *278*].

Н. Мацяш звярталася да вуснай народнай творчасці не толькі ў ранніх творах. Фальклорны здабытак беларусаў яна засвоіла на ўсё жыццё. Выкарыстанне вуснай народнай творчасці ў паэзіі Н. Мацяш шмат чаго гаворыць пра ўнутраны свет паэтэсы, пра яе асобу, погляды на жыццё.

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Мацяш, Н.* Душою з небам гаварыць : выбраная лірыка / Н. Мацяш. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. – 462 с.
2. *Смаль, В.* «А свет гэткі гожы і вабны наўкола…». Быццё як спавядальная біяграфія душы Ніны Мацяш / В. Смаль // Роднае слова. – 2003. – № 9. – С. 10 – 15.

# ЗМЕСТ

*ПРАДМОВА*
ФАЛЬКЛОР У ТЭОРЫІ І НА ПРАКТЫЦЫ 3

*Раздзел 1*
ФАЛЬКЛОР У КАНТЭКСЦЕ КУЛЬТУРЫ *8*

*Тамара Варфаламеева*
ШЫРМА–МУЗЫКАНТ: ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІ ПЕРЫЯД 8

*Таццяна Шамякіна*
СУВЯЗЬ СОНЦА І ДУШЫ ЧАЛАВЕКА Ў АРХАІЧНЫХ КУЛЬТУРАХ 14

*Тамара Якіменка*
М. АЛАДАЎ І ЛІНГВА-МУЗЫЧНА-ЭТНАГРАФІЧНЫЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫЧНЫЯ ЭКСПЕДЫЦЫІ НА БЕЛАРУСКАЕ ПАДНЯПРОЎЕ 1926/1928 гг.: ЭТНАМУЗЫКАЛАГІЧНЫ РОЗДУМ 20

*Таццяна Кабржыцкая*
УКРАІНАЗНАВЕЦ МІХАІЛ МАКСІМОВІЧ (1804–1873) : ДА 210-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПЕРШАГА РЭКТАРА КІЕЎСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА 29

*Рыма Кавалёва*
СТРУКТУРНА-СЭНСАВЫ СТРЫЖАНЬ ГАЛОЎНАЙ ПЕСНІ АБРАДУ «СТРАЛЫ»: ТРАІСТАСЦЬ І ТРЫЯДЫЧНАСЦЬ 32

*Таццяна Лук'янава*
МЕТОДЫКА ФЕНАМЕНАЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ НЯКАЗКАВЫХ ЖАНРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРОЗЫ 35

*Вольга Враб'ёва, Ніна Здановіч*
ТРАДЫЦЫЙНАЯ АБРАДАВАЯ КУЛЬТУРА ЯК ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ 38

*Таццяна Кохан*
ТВОРЧАСЦЬ ЯНА ЧАЧОТА І ФАЛЬКЛОР 42

*Настасся Даніловіч*
КАЛЯНДАРНА-ПЕСЕННАЯ ТРАДЫЦЫЯ ВЕРХНЯГА НАД'ЯСЕЛЬДЗЯ : З ЭКСПЕДЫЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ АКАДЭМІІ МУЗЫКІ 2013 года НА ПРУЖАНШЧЫНУ ПА СЛЯДАХ Р. Р. ШЫРМЫ 49

*Ала Захарэвіч*
МОДА ВЯСКОВАЙ МОЛАДЗІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ Ў 30–50-Я ГАДЫ XX СТАГОДДЗЯ 56

*Юлія Акуліч*
ПРЫНЦЫПЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ Ў ФАЛЬКЛОРНЫХ ЗБОРНІКАХ І НАВУКОВЫХ ВЫДАННЯХ 59

*Źmicier Karaloŭ*
BELARUSSISCHE BURGEN UND SCHLÖSSER 66

*Раздзел 2*
*ФАЛЬКЛОР – ЛІТАРАТУРА – МОВА* *92*

*Елена Вострикова*
ФОЛЬКЛОР В РОМАНЕ МИЛАНА КУНДЕРЫ «ШУТКА» 92

*Александр Горбачев*
ФОЛЬКЛОРНАЯ ОСНОВА, НАРОДНОСТЬ, ЖАНРОВАЯ СПЕЦИФИКА И ХУДОЖЕСТВЕННАЯ КОНЦЕПЦИЯ БАСЕН И. А. КРЫЛОВА 99

*Юлия Гришкевич*
ОБРАЗ МИРОВОГО ДРЕВА В ТВОРЧЕСТВЕ К. Д. БАЛЬМОНТА 105

*Наталля Базар*
ФАЛЬКЛОРНЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ НІНЫ МАЦЯШ 110

*Вольга Буйноўская*
НАРОДНА-ПАЭТЫЧНАЯ ПАРАДЫГМА Ў ПЕРАКЛАДЗЕ «СЛОВА ПРА ПАХОД ІГАРА» М. ГАРЭЦКАГА 114

*Анна Квачек*
ЕВРОПЕЙСКИЙ ФОЛЬКЛОР В СОВРЕМЕННОЙ ФРАНЦУЗСКОЙ ЛИТЕРАТУРЕ (ТВОРЧЕСТВО БЕРНАРА ФРИО) 118

*Маргарыта Латышкевіч*
ФАНТАСТЫЧНАЕ Ў ЦВЕТАНА ТОДАРАВА 123

*Анна Наумова*
НАЦИОНАЛЬНОЕ МИРОВОЗЗРЕНИЕ И ФОЛЬКЛОР В ПРОИЗВЕДЕНИЯХ ИВО АНДРИЧА 125

*Аляксандра Чарнавокая*
ЖАНЧЫНА ЯК КАМІЧНЫ ПЕРСАНАЖ У ПРОЗЕ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТ.: АД «УСЕНАРОДНАГА» ДА АСАБІСТА-ІНТЭНЦЫЯНАЛЬНАГА СМЕХУ 130

*Вольга Круглова*
МІФАЛАГІЧНЫ КАМПАНЕНТ У СВЕТАПОГЛЯДЗЕ ГРЫШКІ – ГАЛОЎНАГА ГЕРОЯ ПАЭМЫ ЯНКІ ЛУЧЫНЫ «ПАЛЯЎНІЧЫЯ АКВАРЭЛЬКІ З ПАЛЕССЯ» 136

*Алексей Чернецов*
СПЕЦИФИКА ХРОНОТОПА РОМАНА ГЕНРИ ЛАЙОНА ОЛДИ «ОДИССЕЙ, СЫН ЛАЭРТА» 140

*Ирина Ярович*
КОНЦЕПТЫ «БОГАТСТВО» И «БЕДНОСТЬ» В БАЛЛАДАХ О РОБИН ГУДЕ 147

*Аляксандр Яфімаў*
ВОБРАЗ ЗМРОЧНАГА ЖНЯЦА І ПЛЯСКА СМЕРЦІ Ў ФУНЕРАЛЬНЫМ ТВОРЫ «РЭХА ЖАЛЮ…» 149

*Віктар Каратай*
АД ДРАМЫ ДА МЕНІПЕІ. ЖАНРАВАЯ ПОЛІФАНІЧНАСЦЬ ПАЭМЫ ЯНКІ КУПАЛЫ «СОН НА КУРГАНЕ» 154

*Вольга Арцёмава*
МІФАЛАГІЧНЫ СКЛАДНІК ВАДЫ Ў ФРАЗЕАЛАГІЧНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ І АНГЛІЧАН 156

*Ірына Савіцкая*
ФАЛЬКЛОРНЫ СКЛАДНІК УСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНЫХ СЛОЎНІКАЎ 161

*Раздзел 3*
*МАТЭРЫЯЛЫ II РЭСПУБЛІКАНСКАГА НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАГА СЕМІНАРА «СУЧАСНАЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА, МІФАЛОГІЯ, ЭТНАЛОГІЯ: ПАЗІТЫЎНЫЯ, НЕГАТЫЎНЫЯ, СУПЯРЭЧЛІВЫЯ ВЕКТАРЫ РУХУ»* *169*

*Вольга Прыемка*
АБ ПРАЦЫ СЕМІНАРА 169

*Александр Морозов*
СОЦИОКУЛЬТУРНЫЙ КОНТЕКСТ ФУНКЦИОНИРОВАНИЯ ДУХОВНЫХ СТИХОВ В СЛАВЯНСКОМ МИРЕ 172

*Алесь Дуброўскі*
ДЫЯЛОГ ЯК БАГАСЛОЎСКАЯ КАТЭГОРЫЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ХРЫСЦІЯНСКАЙ МІСІІ : БІБЛЕІСТЫЧНЫ І МІСІЯЛАГІЧНЫ АСПЕКТЫ 185

*Рыма Кавалёва*
ЗАДАЧЫ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ Ў СВЯТЛЕ ДЫЯЛОГУ ЯЗЫЧАСКАЙ І ХРЫСЦІЯНСКАЙ КУЛЬТУР 190

*Анна Жегало*
ЯЗЫЧЕСТВО И ХРИСТИАНСТВО В СВЕТЕ ФЕНОМЕНОЛОГИИ ДИАЛОГА 196

*Таццяна Рабец*
ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ХРЫСЦІЯНСКІХ ПЕРСАНАЖАЎ ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ЗАМОВАХ 199

*Надежда Конобеева*
ПРОБЛЕМА ИНТЕРПРЕТАЦИИ ХРИСТИАНСКИХ И ЯЗЫЧЕСКИХ МОТИВОВ В ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ ПРАКТИКЕ 207

*Вольга Палукошка*
ДЗЕНЬ СВЯТОЙ ГАННЫ Ў НАРОДНЫМ КАЛЕНДАРЫ СТОЛІНШЧЫНЫ І АГУЛЬНАЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ 212

*Аляксандр Яфімаў*
ХРЫСЦІЯНСКІЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў БЕЛАРУСКІХ ЛАЦІНАМОЎНЫХ ПАЭМАХ XVI – XVII стст. 216

*Лия Баранкевич*
ДУАЛИЗМ ПОМИНАЛЬНЫХ ДУХОВНЫХ СТИХОВ 223

*Эдуард Дубянецкі*
ФАЛЬКЛОР ЯК СІНКРЭТЫЧНЫ ФЕНОМЕН НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ 229

*Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч*
ПРЫРОДНЫЯ СВЯТЫНІ БЕЛАРУСІ Ў КАЛЯНДАРНЫХ АБРАДАХ (СІНКРЭТЫЗМ ЯЗЫЧНІЦТВА І ХРЫСЦІЯНСТВА) 232

*Раздзел 4*
*МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЭНЦЫКЛАПЕДЫЙ І СЛОЎНІКАЎ* *244*

*Рыма Кавалёва*
МІФАСФЕРА 244

*Славяна Шамякіна*
ЧАРАДЗЕЙНА-ФАНТАСТЫЧНЫЯ КАЗКІ 246

*Славяна Шамякіна*
КАЗКІ ПРА АСІЛКАЎ 249

*Ольга Полукошко*
ДЕВИЧИЙ АЛЬБОМ 250

*Ольга Полукошко*
МУЖСКОЙ АЛЬБОМ 251

*Раздзел 5*
*РЭЦЭНЗІІ* *254*

*Вольга Вараб'ёва*
«ЗРАЗУМЕЦЬ ДУШУ НАРОДА…» 254

*НАШЫ АЎТАРЫ* *258*